**У рамках рэспубліканскай акцыі “Дом без гвалту” у ДУ “Тэрытарыяльны центр абслугоўвання насельніцтва Ашмянскага раёна” прайшлі мерапрыемствы:**

Пры правядзенні акцыі **“Дзе ёсць гвалт – няма сям’і”**, якая праходзіла з **23 па 26 красавіка 2018 года**, спецыялісты аддялення сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі наведалі па месцы пражывання сем’і з непаўналетнімі дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, правялі прафілактычныя гутаркі аб недапушчэнні здзяйснення гвалтоўных дзеянняў у дачыненні да членаў сям'і, праінфармавалі аб арганізацыях, якія аказваюць дапамогу пацярпелым ад гвалту у сям’і, распаўсюдзілі прафілактычныя лістоўкі і буклеты.





**З 23 па 26 красавіка** прайшла акцыя **“Старых у крыўду не дадзім”,** яе мэта – папярэджанне злачынстваў у дачыненні да сацыяльна неабароненых катэгорый насельніцтва. Спецыялісты ДУ “ТЦСАН Ашмянскага раёна” у складзе назіральных камісій па абследаванні грамадзян і сем'яў, якія пражываюць на тэрыторыі Ашмянскага раёна, наведалі па месцы пражывання грамадзян пажылога ўзросту, далі інфармацыю аб арганізацыях, якія аказваюць дапамогу і падтрымку грамадзянам, пацярпелым ад гвалту ў сям'і.





**26 красавіка 2018 года** спецыялісты аддзялення сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі сумесна з РАУС, валанцёрамі атрада “Парус Надзеі” выйшлі на цэнтральную вуліцу горада Ашмяны і прапанавалі ўсім жадаючым прыняць удзел у акцыі **“Рука, якая не ўдарыць”.**

Галоўнай мэтай правядзення дадзенага мерапрыемства з'яўляецца імкненне прыцягнуць увагу грамадскасці да праблемы існавання гвалту ў нашым грамадстве і заахвоціць людзей да талерантных, ветлівых адносін адзін да аднаго.

Падчас акцыі жыхары Ашмян пакінулі адбітак сваёй далоні на стэндзе як сімвал процідзеяння ўсіх праяў гвалту ў грамадстве. Таксама раздавалася друкаваная прадукцыя з інфармацыяй аб кантактах устаноў, куды можна звярнуцца за дапамогай у выпадку здзяйснення гвалту.






Эта рука
никого
не ударит!